# Важная асоба, якая ходзіць гогалем.

Зусім хутка ўсіх аматараў прыроды чакаюць шматлікія акцыі і конкурсы ад “Аховы птушак Бацькаўшчыны” (АПБ), падчас якіх можна будзе бліжэй пазнаёміцца з чорна-белым прыгажуном — птушкай 2016 года ў Беларусі, а таксама зрабіць яго жыццё крышку больш шчаслівым.

Ці ведаеце вы, што гогаль звычайны не будуе гняздо на зямлі, як большасць суродзічаў з сямейства качыных, а займае дуплы старых дрэў? “На многіх тэрыторыях уздоўж азёр і рэк засталося мала старых дуплаватых дрэў, і птушкі не могуць знайсці прыдатнага месца для гнязда, — тлумачыць супрацоўніца па прыродаахоўных пытаннях АПБ Вольга Лукшыц. — Вырашыць праблему могуць біятэхнічныя мерапрыемствы: пабудаваць “дупло” можа любы чалавек. Мы раскажам, як зрабіць домік для гогаля, правядзём майстар-класы для ахвотных і разам будзем вырашаць “кватэрнае пытанне” птушак. Асобную ўвагу нададзім вясенняму і асенняму паляванню на вадаплаўных: гогаль не з’яўляецца паляўнічым відам, але часта церпіць з прычыны неадукаванасці паляўнічых”.

**13 фактаў аб звычайным гогале:**

1. Звычайны гогаль — адзін з 15 відаў качак, якія гняздуюцца ў Беларусі.
2. Радзімай гогаля лічыцца Паўночная Амерыка, адкуль птушка перабралася спачатку ў Азію, а потым распаўсюдзілася па ўсім паўночным паўшар’і.
3. Увесну беларускія гогалі аднымі з першых спяшаюцца на радзіму з зімовак у Заходняй Еўропе. Некаторыя асобіны застаюцца на зіму і ў нашай краіне.
4. З лютага самцы пачынаюць такаваць — выконваць адмысловы “танец”, які прыцягвае самак. Качар распускае хвост, закідвае галаву, “бразгоча” голасам і падымае вакол сябе фантан пырскаў.
5. Гогаль — качка, якая гняздуецца ў дуплах дрэў. Домам для яе становяцца і адмысловыя гнездавыя скрыні (гагалятнікі), якія чалавек можа развесіць недалёка ад вады. Менавіта дзякуючы ім гэтая птушка вырашыла “кватэрнае пытанне”, павялічыла сваю колькасць у Беларусі і ў 2004 годзе пакінула Чырвоную кнігу.
6. Насяляе сажалкі і рэкі, каля якіх ёсць старыя лясы. Можа жыць на азёрах сярод мохавых балот, дзе слабая кармавая база і іншых качак не сустрэнеш.
7. Пры недастатковай колькасці дуплаў у месцах гняздоўя паміж самкамі назіраюцца бойкі за валоданне гняздом. Нярэдка ў адным дупле нясуцца адразу дзве качкі гогаля.
8. Качаняты выскокваюць з дупла на покліч маці. Першы выхад у вялікі свет можа пачынацца з 15-метровага скачка! Птушаняты не ўмеюць лётаць і проста парашутуюць, растапырыўшы крылцы і перапонкі на лапах.
9. Гогаль харчуецца воднымі насякомымі, ракападобнымі і малюскамі. Ежу здабывае са дна на глыбіні да 10 метраў.
10. Гогаля ў палёце можна вызначыць нават з заплюшчанымі вачамі: у яго па асабліваму “свішчуць” крылы.
11. Самы стары гогаль, па даных кальцавання, пражыў 16 гадоў і 11 месяцаў.
12. Магчыма, назва “гогаль” узнікла ад чувашскай мянушкі “гогул”. Падобныя назвы ёсць у чэшскай (hohol severni), славацкай (hlaholka severska), польскай (gagol), латышскай (gegals) мовах. Англічане вырашылі звярнуць увагу на жоўты колер вачэй качара і назвалі птушку “Goldeneye” (“залатое вока”).
13. Птушка 2016 года ў Беларусі — галоўны герой фразеалагізма “хадзіць гогалем”. Устойлівае словазлучэнне, якое азначае “мець бравы, незалежны выгляд”, нарадзілася выключна дзякуючы незвычайнай паходцы гэтай птушкі. Яна ходзіць павольна і перавальваючыся, нібы важная, самазадаволеная асоба.

**Источник:** Родная прырода. — 2016. — № 1. — С. 13.